**Багдановіч, Н.** Вайна заблара праз дзесяцігоддзі / Н. Багдановіч // Патрыёт (Ушачы). – 2017. – 15 лют. – С. 3.

## ВАЙНА ЗАБРАЛА ПРАЗ ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ

У такі ж лютаўскі дзень восем год назад Яўгенія Міхайлаўна Пятніца чакала мужа на абед. Нетаропка разагрэла ежу, бо на хлебазавод ёй было ў начную змену, і прыслухоўвалася – вось-вось грукнуць дзверы і яе Віця, нахвальваючы боршч, пачне скупа расказваць пра працоўныя навіны. Ад мехустаноўкі, як у народзе звыкла называюць ААТ «Ушачы», да іх дома шлях няблізкі, але на веласіпедзе муж пераадольваў яго шпарка, таму жонка раз-пораз паглядвала на гадзіннік – нешта ён сёння затрымліваецца... Дзверы грукнулі неяк нечакана і гучна. Убачыўшы ў прыхожай Васіля Бяльковіча і Міхаіла Данілёнка, жанчына схамянулася – нешта з Віцем! Няшчасны выпадак?! Пашкодзіў руку на станку?.. Але апушчаныя долу вочы сяброў па працы і па афганскіх выпрабаваннях усё сказалі ёй без слоў... Любімы чалавек пайшоў з жыцця ціха і «сціпла» – яго сэрца ўмомант спыніла лопнуўшая анеўрызма...

Той лютаўскі поўдзень застаўся незагойнай ранай і на сэрцы Яўгеніі Міхайлаўны. І хлуслівым аказаўся верш, запісаны некалі Віктарам у свой паходны афганскі блакнот:

«Зачем клянётесь вы, когда мы уезжаем,
Зачем клянётесь вы нас терпеливо ждать?
Ведь в то же время каждый понимает,
Что нас дождётся только мать...»

Гэта не пра яе, бо яна б абавязкова дачакалася. А зараз застаецца толькі ўспамінаць, якім добрым і чулым ён быў, як гадавалі разам трох дзяцей...

...– Напісаць пра майго мужа? Нават не ведаю... Каб ён быў жывы – нізавошта б на гэта не згадзіўся, – вагалася Яўгенія Міхайлаўна. – Настолькі сціплым быў, што нават касцюм з медалём «За баявыя заслугі» і юбілейнымі ўзнагародамі ніколі не апранаў. І пра службу амаль нічога не расказваў, усё ўнутры хаваў. Хіба што ў сне, бывала, пачынаў гучна і апантана выкрыкваць незнаёмыя словы – напэўна, урыўкі «душманскай» лаянкі...

Але ж час і смерць сціраюць многія забароны. І вось на маім стале – афганскі альбом і прыгаданы блакноцік з вершамі, па якіх хіба што і можна зараз аднавіць храналогію ваеннай службы простага вясковага хлопца з Лабаней Віктара Пятніцы. Юнак трапіў у гэтае пекла ў самым пачатку вайны. Служыў на БТРы радыётэлеграфістам з 1980 па 1982 – 730 незабыўных дзён. Са старонак альбома ўсміхаюцца прыгожыя маладыя людзі – здаецца, і няма наўкол вайны і смерці. Нямала нават лірычных, жартаўлівых кадраў: вось баявы сябра Віктара трымае двух шчанят, а вось групавы здымак, на якім у руках у салдат букеты лугавых кветак. І нават не верыцца, што зусім скора кветкі лягуць да запаяных трун некаторых з гэтых усмешлівых хлопцаў.

Увогуле наш зямляк амаль нікому не расказваў, як цяжка і страшна было на вайне. Хіба што фота, на якім ён з перавязанай галавой, сведчыць пра раненне, атрыманае падчас аднаго з баёў. Віктара збіраліся адправіць у шпіталь, аднак доўгі час ніводны вертапёт не мог прызямліцца ля іх кішлака, бо мясцовасць пастаянна абстрэльвалі маджахеды. Так і перанёс хлопец гэтае раненне «на нагах», а яно потым не раз давала пра сябе знаць...

Не менш цяжкім выпрабаваннем для байцоў быў голад, бо з-за таго ж пастаяннага абстрэлу іншы раз ні наземны, ні паветраны транспарт не мог даставіць ім харчаванне. Спрабавалі скідваць скрыні з

правізіяй з верталёта, але ўпаўшыя з вышыні прадукты разляталіся па зямлі і ператвараліся ў пыл. Неяк Віктар прызнаўся, што давялося ім есці нават вожыкаў...

Аднак усяго гэтага няма на здымках альбома. Ды і сам яго ўладальнік – толькі на лічаных кадрах, а усе цэнтральныя месцы адведзены таварышам. Ім прысвечаны і гэты верш у баявым блакноце:

«У нас в песках один закон, и нет его верней.
В песках всегда нужна вода, а друг – ешё нужней.
А коль во фляге два глотка, последний из глотков
Отдай для друга своего – таков закон песков».

Баявое сяброўства было для Віктара Пятніцы найвялікшай каштоўнасцю. «Вы нават не ўяўляеце, якім святам быў для яго дзень 15 лютага, калі ўшацкія «афганцы» збіраліся разам, –прыгадвае Яўгенія Міхайлаўна. – Гэта быў, безумоўна, самы важны дзень у яго календары – куды там імянінам ці Новаму году...»

15 лютага 2009 года з нецярплівасцю чакалі ўсе воіны-інтэрнацыяналісты. 20-я гадавіна вываду савецкіх войск з Афганістана для нашых суайчыннікаў была азнаменавана адкрыццём у Мінску Вострава слёз – манумента, які ўвекавечыў памяць загінуўшых у чужой усходняй краіне беларускіх хлопцаў. Да свята ўшацкія воіны-інтэрнацыяналісты арганізавалі паездку да гэтага помніка. Накіраваўся ў сталіцу і Віктар Міхайлавіч Пятніца. Яго сябры расказваюць, як мужчына ўважліва ўчытваўся ў радкі з прозвішчамі ахвяр вайны і раптам, убачыўшы нешта на адной з мемарыяльных пліт, рэзка збялеў: па яго звычайна такім спакойным твары пабеглі слёзы. І нават сябрам не сказаў, што яго так уразіла – магчыма, убачыў ён імя аднаго з тых усмешлівых хлопцаў з альбомных старонак, якога лічыўвыжыўшым...

Афганская вайна амаль праз тры дзесяцігоддзі нібы працягнула да яго свае рукі – праз два дні сэрца Віктара Міхайлавіча спынілася...

Штогод напярэдадні Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў Яўгенія Міхайлаўна прыносіць у рэдакцыю радкі віншаванняў і ўдзячнасці ўшацкім «афганцам», якія не забываюць яе мужа, помняць і іншых баявых сяброў, якія пайшлі з жыцця ў час і пасля той недарэчнай вайны. «Нават не ведаю, як бы змагла перажыць боль страты, каб не падтрымлівапі мяне Вася Бяльковіч, Міша Данілёнак, Вася Полазаў, Валодзя Андрыковіч, Толік Жаваранак, Пеця Турчыновіч, Толік Рудкоўскі, Валодзя Якубовіч і іншыя былыя воіны-інтэрнацыяналісты. Прабачце, што называю вас вось так, ласкавымі імёнамі, але ж вы для мяне – як родныя людзі!» – прызнаецца Яўгенія Міхайлаўна.

І сапраўды, баявым братэрствам ушацкіх «афганцаў», іх гатоўнасцю падставіць сябру плячо можна толькі захапляцца. «Закон пяскоў» яны памятаюць і зараз.

***Н. БАГДАНОВІЧ***